Рэжым доступу : http://mova.na.by/. – Дата доступу : 30.03.2015.

7. Таварыства Беларускай Мовы [Электронны рэсурс] / Таварыства Беларускай Мовы. – Мінск, 2015. – Рэжым доступу : http://tbm-mova.by/. – Дата доступу : 30.03.2015.

**Ждан Н.А.,** студэнтка 119 гр.
Навуковы кіраўнік – Войцік С.Ф.

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ З ДЗЕЦЬМІ МАЛОДШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ Ў АМАТАРСКІМ ФАЛЬКЛОРНЫМ АНСАМБЛІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучаснай сістэме выхавання малодшы школьны ўзрост ахоплівае перыяд жыцця дзіцяці з сямі да дзесяці-адзінаццаці гадоў (I–III класы школы).

У гэты час у выхаванні маладога пакалення этнаграфія і фальклор павінны займаць вядучае месца. Засваенне ведаў, уменняў і навыкаў малодшага школьніка адбываецца пры занятку рознымі відамі мастацтва: літаратура, жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, музыка, танец і г.д.

Агмені этнаграфічнай і фальклорнай культуры ў агульнаадукацыйнай школе захаваліся толькі дзякуючы энтузіязму і адданасці сваёй справе выкладчыкаў і кіраўнікоў устаноў культуры. Гэтая справа захоўваецца дзякуючы ўвядзенню факультатыўных заняткаў у школах, або працы гурткоў у палацах, дамах і цэнтрах творчасці, дзе ў аснову пакладзена вывучэнне сцэнічнага, музычнага і паэтычнага фальклору. Далучэнне дзяцей да беларускай народнай культуры адбы-

ваецца цераз вывучэнне свят, звязаных з каляндарна-земляробчым цыклам: каляды, масленка, гуканне вясны, грамніцы, вялікдзень, дажынкі і г.д.

Знаёмства дзяцей з народна-песеннай культурай абрадаў Беларусі адбываецца паступова з 6–7 гадоў. Галоўнай мэтай такіх святаў з'яўляецца далучэнне вучня да творчага працэсу. Паказу сцанічнай дзеі папярэднічае напісанне сцэнарыя, пошук паэтычных і празаічных тэкстаў, музычнага матэрыялу (песеннага, танцавальнага, інструментальнага), вывучэнне і стварэнне строяў, атрыбутыкі, дэкарацый. Як правіла, пастаноўка такога мерапрыемства – гэта калектыўная праца, у якой заняты сцэнарыст, рэжысёр, балетмайстар, хормайстар, канцэртмайстар, касцюмер, грымёр. Але цяпер галоўным арганізатарам і стваральнікам свята з'яўляецца кіраўнік гуртка, або факультатыва разам з яго удзельнікамі. Падрыхтоўка сцэнічнага дзеяння прадстаўляе ўнікальную магчымасць акунуцца ў свет гісторыі паходжання таго ці іншага свята, паданняў, міфаў, вывучэнне дзеючых персанажаў, часцей за ўсё казачных, абрадавых дзеянняў, танца, песенных традыцый.

*Творчымі здольнасцямі надзелены кожны чалавек. Творчасць – гэта працэс дзейнасці, які стварае якасна новыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Для іх стварэння неабходны:*

1. *Творчая асоба (выкладчык).*
2. *Асяроддзе, у якім ажыццяўляецца творчасць (дзіцячы калектыў).*
3. *Творчы працэс (заняткі).*
4. *Паказ творчай дзейнасці (канцэрт).*

*Творчасць для дзяцей гэтак жа значная, як і гульня. Свабода самавыяўлення малодшых школьнікаў звязваецца з сюжэтнай музычна-дыдактычнай гульнёй, якая ажыццяўляецца з дапамогай гульнёвай формы і становіцца для іх натуральнай і актуальнай. Кіраўнікі фальклорнага*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*гуртка ці факультатыва стараюцца з першай хвіліны заняткаў напоўніць урок так, каб ён быў з аднаго боку цікавым і зразумелым дзецям, а з другога – вырашаў пастаўленыя выкладчыкам задачы, напрыклад, выработка правільнага дыхання, выразная і дакладная дыкцыя, развіццё дыяпазона голасу, ці пачуцця рытму.*

*Своеасаблівая моўная сітуацыя (білінгвізм або двухмоўе), якая склалася ў сучаснай Беларусі, не дае магчымасці адразу далучыць вучняў да беларускага матэрыялу. Школьнікі, ў асноўным, знаходзяцца ў рускамоўным асяроддзі і таму не заўсёды разумеюць беларускія тэксты, а часам нават не хочуць іх разумець.* Як вядома, навакольныя з'явы ўспрымаюцца дзецьмі запаволена, і ўспрыманне ці вывучэнне тэкстаў беларускіх песень павінна праводзіцца паступова.

У рабоце рэкамендуецца выкарыстоўваць такі літаратурны матэрыял, які будзе зразумелы ім па зместу. Падбіраючы тэксты трэба ўлічваць узровень моўнага развіцця дзіцяці, слоўны запас. На кожным занятку рэкамендуецца вывучаць з вучнямі прыказкі, прымаўкі, загадкі, якія дапамагаюць ім узбагаціць мову, пашырыць светапогляд і развіць творчую фантазію. Праз вобразы жывёльнага свету дзеці вывучаюць рысы характараў, якія датычаць таго ці іншага персанажа. Напрыклад:

клікаў воўк казу на абед, ды тая не ідзе;
ліска семярых ваўкоў падманіць;
лісіца спіць, а курэй бачыць.

Ужыванне настаўнікам на занятках спецыяльных практыкаванняў па выхаванні навыкаў правільнага вымаўлення прыводзіць да ўдасканалення артыкуляцыі і дыкцыі школьніка. Добра калі на кожную літару алфавіта выкладчык падбярэ вершаваныя радкі. Напрыклад:

жук-жук не жужжы, дзе хаваешся скажы;
ішлі мышы з кірмашу, выйшлі мышы на шашу;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бацька бусел ля буслянкі буслянятам баяў байкі;

ляжаў Лявон ля нівы, заснуў лайдак лянівы.

Музычнае выхаванне дзяцей павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з узростам і асаблівасцямі развіцця іх галасавога апарата. З малодшымі школьнікамі трэба выкарыстоўваць мелодыі ў спакойным, запаволеным тэмпе. Стамляюць дзяцей і доўгія музычныя фразы. Улічваючы гэта, у работу з імі настаўнік павінен уключаць музычны матэрыял з лёгка успрымальнымі мелодыямі, з невялікім дыяпазонам голасу, так як дзіцячыя вакальныя магчымасці не маюць шырокіх тэсітурных умоў. У гэтым дапамагае спецыяльна падабраны народна-песенны музычны матэрыял.

Рэкамендуецца вакальныя заняткі пачынаць з падрыхтоўкі галасавога апарата. У распеўках-практыкаваннях выкарыстоўваюцца такія тэксты, якія будуць цікавіць дзяцей. Напрыклад:

1. Скача грак так і сяк, скача грак кракавяк. Скача грак з грачыхаю ды ад пылу чыхае. (Распеўка на адной ноце).

2. Ой, вы куры, куранятачкі не хадзіце каля хатачкі! (Распеўка ў межах вялікай секунды).

3. Пайшоў каток у лясок, знайшоў каток паясок. (Распеўка ў межах вялікай тэрцыі).

4. А ў нядзельку раненька да зары, шчабятала ластаўка на муры.(Распеўка ў межах кватры).

5. Я цяцерку пасу, ух я! На зялёным лугу, ух я! Я цяцерку на мост, ух я! Я цяцерку за хвост, ух я! (Распеўка ў межах квінты).

У малодшым школьным узросце максімальны інтэрвал дыяпазону голасу – чыстая квінта, таму беларускі песенны фальклор , як мага лепей падыходзіць да работы з дзецьмі. Пасля распевак пачынаецца работа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

непасрэдна над беларускай народнай песняй. У якасці цікавага прыклада можна прапанаваць песню-сцэнку ―Пайшла курка да лісачкі".

Гаворка ў гэтым творы ідзе пра Курку, якую падманным шляхам Ліска запрасіла ў госці, а ў выніку яе з'ела. Прывядзем фрагмент паэтычнага тэксту песні.

Запрашала Ліска Курку да сябе ў госці:
―Выйдзі, цыпка, за рэчаньку за кляновы мосцік".
Прыпеў: Ля-ля-ля, ля-ля-ля, за кляновы мосцік – 2 ир.
А я ж цябе пачастую грэчкаю, пшаніцай,
За гарою з крынічанькі напаю вадзіцай.
Падмятала я сцяжынкі, падмяла дарожкі.
Ідзі, курка, ступай смела – не паколеш ножкі.
Пайшла курка да лісачкі за кляновы мосцік,
Засталіся ад курачкі кіпцюры ды хвосцік.

*Гэтая песня, у якой праз вобразы хітрай, спрытнай, верткай ліскі і разгубленай, даверлівай куркі, увасобленыя ў паэтычным тэксце, вучыць дзяцей такім якасцям як: асцярожнасць і ўважлівасць у зносінах. Акрамя таго, літаратурны сюжэт спрыяе з'яўленню зацікаўленнасці школьнікаў малодшага ўзросту да фальклорнай спадчыны Беларусі. Музычная частка твора дае магчымасць развіць і замацаваць першапачатковыя вакальна-харавыя навыкі. Сцэнічнае ўвасабленне песні-сцэнкі пад кіраўніцтвам настаўніка дае магчымасць як мага выразней раскрыць акцёрскія здольнасці дзяцей. Такім чынам, праз ўспрыманне працэсу стварэння тэатральна-музычнай дзеі малодшымі школьнікамі выхоўваецца зацікаўлінасць да творчай самарэалізацыі і самавыяўлення.*

*У сувязі з вышэй пададзеным можна зрабіць наступныя высновы:*

1. Агмені этнаграфічнай і фальклорнай культуры ў агульнаадукацыйнай школе захаваліся толькі дзякуючы энтузіязму і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адданасці сваёй справе выкладчыкаў, мэтай якіх з'яўляецца далучэнне дзяцей малодшага школьнага ўзросту да фальклору Беларусі.

2. *Творчасць – гэта працэс дзейнасці, які стварае якасна новыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Для іх стварэння неабходны: творчая асоба (выкладчык); асяроддзе, у якім ажыццяўляецца творчасць (дзіцячы калектыў); творчы працэс (заняткі); паказ творчай дзейнасці (канцэрт).*

3. *Праз ўспрыманне працэсу стварэння тэатральна-музычнай дзеі малодшымі школьнікамі выхоўваецца зацікаўленасць да творчай самарэалізацыі і самавыяўлення.* Фальклору нельга навучыць, да яго можна толькі далучыць. Гэта значыць ўвесці ў яго прастору, зрабіўшы яго агульным для ўсіх дзяцей.

---

1. Аляхновіч А.М. Фальклор у выхаванні школьнікаў: дапаможнік для настаўнікаў музыкі і спевакоў, класных кіраўнікоў, выхавацеляў / А. М. Аляхновіч – Мн. : Чатыры чвэрці, 2008. – 200 с.

2. Сучкоў, І.І. Беларускі фальклор у школе. 1-ы клас : дапам. для настаўніка / І.І. Сучкоў, Ф.І. Таранава, Л.У. Рута, В.В. Куржалава. – Мн. : Нар. асвета, 1996. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ